СМЕРЦЬ НЯМЕЦКІМ АКУПАНТАМ!

Камуністычная партыя (большавікоў) Беларусі

# СТАЛІНЕЦ

ОРГАН ГРЭСКАГА РК КП(б)Б

№ 7 (738) | Аўторак, 1 лютага | 1944 г.

**Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 1 студзеня 1944 г.** за ўмелае і мужнае кіраўніцтва баявымі аперацыямі партызанскіх атрадаў па авалоданню пераправамі на рэках Днепр, Дэсна і Прыпяць паўночней Кіева, утрыманне пераправаў да падыхода часцей Чырвонай Арміі і праяўленыя пры гэтым адвагу і геройства прысвоена званне Героя Савецкага Саюза з уручэннем ордэна Леніна і медалі „Залатая Зорка": Бовкуну І. М., Сіmоненко Н. Д. і Шевчуаву А. І.

## За часць свайго атрада

З кожным днём расце і пашыраецца партызанскі рух у Беларусі. У партызанскія атрады са зброяй у руках уліваюцца ўсё новыя юнакі, дзяўчаты і пажылыя сяляне.

Людзі, уліваючыся ў партызанскія атрады, аддаюць усе свае сілы на справу Радзімы і, не шкадуючы свайго жыцця, бязлітасна знішчаюць нямецкіх галаварэзаў.

З пачатку Айчыннай вайны на 1 снежня 1943 года народныя мсціўцы Беларусі знішчылі звыш 40 вышэйшых чыноўнікаў нямецкай улады, 282.000 нямецкіх салдат і афіцэраў, спусцілі пад адхос 5.756 воінскіх эшалонаў, разбілі 3.443 цягнікі, 40.284 вагоны, узарвалі і спалілі 556 чыгуначных мастоў, знішчылі 10.633 аўтамашыны, 812 танкаў.

Добрых вынікаў у барацьбе з акупантамі дабіліся атрады, дзе камандзірамі Барыс М., Васіль З., Кузьма П., якія маюць на сваіх баявых рахунках па некалькі спушчаных пад адхос нямецкіх эшалонаў, дзесяткі ўзарваных аўтамашын і сотні забітых гітлераўцаў.

Зараз Чырвоная Армія прыбліжаецца да раёнаў Мінскай вобласці — гэта патрабуе ўзмацнення ўдараў па тылах ворага. Кожны камандзір і камісар атрада, камандзір падраздзялення і ўсе партызаны павінны змагацца за часць свайго атрада, за часць свайго падраздзялення.

Наша задача — не ўпівацца дасягнутымі поспехамі, а штодзённа павышаць баявую дзейнасць кожнага партызана, атрада, падраздзялення.

## X сесія Вярхоўнага Савета СССР 1-га склікання

28 студзеня ў Маскве, у Крамлі, адчынілася X сесія Вярхоўнага Савета СССР 1-га склікання.

Савет Саюза і Савет Нацыянальнасцей на раздзельных пасяджэннях прынялі наступны парадак дня:

1. Зацвярджэнне дзяржаўнага бюджэта СССР на 1944 г. і зацвярджэнне справаздач аб выкананні дзяржаўнага бюджэта СССР за 1940, 1941 і 1942 гады.

2. Аб пераўтварэнні Народнага Камісарыята Абароны і Народнага Камісарыята Замежных Спраў з агульнасаюзных у саюзна-рэспубліканскія народныя камісарыяты.

3. Аб першым намесніку Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР.

З дакладам па першаму пытанню парадка дня сесіі выступіў Народны Камісар Фінансаў СССР дэпутат Звераў.

## З аператыўных зводак Совінформбюро

(З 26 СТУДЗЕНЯ ПА 1 ЛЮТАГА)

Войскі Ленінградскага фронта, працягваючы развіваць наступленне, авалодалі гарадамі і чыгуначнымі вузламі Гатчына (Красногвардзейск), Гохасапа, Тосно, рабочым пасёлкам Сіверскі, занялі 310 другіх населеных пунктаў, вызвалілі чыгуначныя станцыі Каўкель, Веймарн і 17 чыгуначных станцый. Войскі фронта ўплотную падышлі да горада Кінгісеп і вядуць бай на ўскраінах горада. За час наступлення войскі фронта разбілі 10 пяхотных дывізій і нанеслі цяжкія страты 2 пяхотным дывізіям праціўніка. Войскі фронта захапілі вялікія трафеі і 3.000 палонных. Праціўнік страціў толькі забітымі звыш 40.000 салдат і афіцэраў.

Войскі Волхаўскага фронта, у час наступальных баёў, авалодалі гарадамі Любань, Чудава і, прасоўваючыся ўперад, занялі звыш 70 населеных пунктаў і 6 чыгуначных станцый. Нашы войскі поўнасцю ачысцілі ад немцаў Октябрскую чыгунку Ленінград-Масква.

Захадней Вялікія Лукі войскі 2-га Прыбалтыйскага фронта ў выніку імклівай атакі авалодалі горадам і вялікім чыгуначным вузлом Новасокольнікі.

Паўночна-захадней і захадней Ноўгарада нашы войскі працягвалі наступленне і занялі некалькі населеных пунктаў.

Усходней Віцебска і паўночней Хрысціноўкі нашы войскі працягвалі адбіваць атакі вялікіх сіл пяхоты і танкаў праціўніка.

За 6 дзён баёў падбіта і знішчана 623 нямецкіх танкі і збіта 187 самалётаў праціўніка.

## ЗА ГРАНІЦАЙ

Войскі саюзнікаў у Італіі прасоўваюцца ўперад у раёне ракі Рапідо і занялі некалькі важных вышынь.

У ноч на 27 і 31 студзеня англійскія бамбардыроўшчыкі зрабілі налёты на Берлін.

Часці Югаслаўскай Народна-Вызваленчай арміі ў заходняй Босніі занялі г. Мрконіч-Град.

## ГАВОРАЦЬ КАМАНДЗІРЫ ПАРТЫЗАНСКІХ ПАДРАЗДЗЯЛЕННЯЎ

# Наша дапамога фронту

Чырвоная Армія наступае, вызваляючы ўсё новыя раёны нашай роднай Беларусі ад нямецкіх акупантаў. Поспехі нашых воінаў і блізасць фронта ўдзесяцяраюць нашу сілу і натхняюць на новыя баявыя справы.

За 5 месяцаў дзейнасці нашага атрада мы правялі рад баявых аперацый. Падрыўныя групы пусцілі пад адкос 6 нямецкіх воінскіх эшалонаў, на шасэйных дарогах падарвана 48 аўтамашыны праціўніка, парвана 65 км. тэлефонна-тэлеграфнай сувязі. Народнымі мсціўцамі атрада забіта 580 гітлераўцаў. Гэта наш баявы рахунак помсты немцам, гэта наша дапамога фронту — Чырвонай Арміі.

У выкананні баявых заданняў адзначыліся камандзіры падраздзяленняў Іван Б., Нікалай М., Барыс Г., Антон К., Ананас К., Міхаіл К., Міхаіл Д., Юсіф Б., Міхаіл П., Іван Я. і партызаны Іван Б., Леанід Г., Нікалай Б., Андрэй Я., Сяргей А., Давід М., Пётр С., Васіль Г., Нікалай С., Александр С., Браніслаў С., Іван К., Александр С., Уладзімір З., Пётр М., Людміла М. і Ананас М.

Асаблівую смеласць праявіла група партызан на чале з Александрам Р. Яна забіла нямецкага обер-лейтэнанта і захапіла ў палон нямецкага єфрэйтара са зброяй.

За час існавання наш атрад значна павялічыўся.

Растуць і яго баявыя справы.

Васіль З.,

камандзір энскага атрада

# Памножым свае поспехі

Выконваючы загад таварыша Сталіна па ўзмацненню ўдараў па тылах ворага і натхнёныя поспехамі Чырвонай Арміі, партызаны нашай роты днём і ноччу не даюць спакою гітлераўцам.

Не мала на баявым рахунку нашых партызан лічыцца забітых немцаў, спушчаных пад адкос эшалонаў, узарваных аўтамашын. Толькі за 25 дзён студзеня ўзарвана на мінах і разбіта з засад 5 нямецкіх аўтамашын, спушчан пад адкос воінскі эшалон, парвана 6 км. сувязі, забіта і паранена 33 гітлераўцы.

Асабліва адзначыліся ў выкананні баявых аперацый Васіль Касцяя, Павел Сафронаў, Цімафееў, Косцяя К. і другія.

Нашы поспехі ў барацьбе з нямецкімі акупантамі не малыя, але ўпівацца імі не збіраемся. Мы будзем зпічаць немцаў да канчатковай перамогі.

Е. П. Марчанка,

камандзір роты атрада ім. Ф.

# Стрымоўваем клятву

Мы пакляліся біць немцаў з іх прыхільнікамі да канчатковага выгнання іх з нашай Радзімы.

Гэтую клятву мы выконваем з чэсцю. Добра авалодаўшы зброяй — кулямётамі, аўтаматамі, вінтоўкамі і падрыўной справай, мы дарэмна не трацім патронаў, а кожную кулю стараемся загнаць у чорнае сэрца ворага.

За апошнія тры месяцы партызанамі ўзвода шляхам мініравання шасэ і дзеяннях паляўнічых груп знішчана 6 і пашкоджана 2 аўтамашыны, забіта і паранена звыш 20 гітлераўцаў, парвана 17 км. тэлефонна-тэлеграфнай сувязі.

Наш узвод удзельнічаў у баявой аперацыі, дзе было знішчана 6 машын ворага; забіта і паранена 52 мадʼяры.

Смела і храбра б'юцца з ворагам партызаны: Ігнат К., Сяргей М., Гаўрыіл К., Міхаіл Б. і другія.

Волкаў,

ком. узвода атрада імя Л.

# Баявы тыдзень

Чырвоная Армія цяпер падышла да раёнаў Мінскай вобласці. У сувязі з прыбліжэннем фронта партызаны атрада імя О. узмацнілі сваю баявую дзейнасць у барацьбе супроць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. За апошні тыдзень партызанамі падраздзялення на шасэйных дарогах падбіта 6 нямецкіх аўтамашын, з іх 2 знішчаны. Пры гэтым забіта і паранена 24 гітлераўцы.

Асабліва адзначылася група Фёдара Л., якая ружэйна-кулямётным агнём падпаліла 2 нямецкіх аўтамашыны, а з імі забіта 9 фрыцаў і ранена 5.

У баявых аперацыях адзначыліся камандзіры аддзяленняў Александр Б., Уладзімір Ж., Іван К. і партызаны Александр Д., Пётр Ш., Александр П., Казімір Ф., Георгій М., Віктар К., П-оў, Б-ін, П. Л-г, Пётр Г., Ч-аў, М-ан і другія.

П. Півень,

палітрук падраздзялення.

# Спалілі 2 машыны

На баявым рахунку партызан нашага аддзялення лічыцца не мала забітых немцаў і парванай сувязі праціўніка.

На днях мы свой баявы рахунак папоўнілі. Падышоўшы да шасэ Слуцк—Мінск я з групай партызан залёг. Доўга чакаць не прышлося, адразу паказалася калона аўтамашын, напоўненых немцамі. Па аўтамашынам быў адкрыт агонь з кулямётаў і вінтовак.

Дзве машыны адразу загарэліся, фрыцы не паспелі нават выскачыць з машын. Трэцяя машына была выведзена са строю, пры гэтым забіта 10 і ранена 5 нямецкіх салдат.

Адзначыліся ў гэтай аперацыі Карамзан А., Канстанцін З., Уладзімір Б., Анатолі Є., Уладзімір Ч., Павел Б. і кулямётчык Александр М.

Фёдар Б.,

ком. аддзялення атрада імя С.

РЭДКАЛЕГІЯ.

Выданне Грэскага РК КП(б)Б